**Спіс цытуемых крыніц**

1. *Грачанікаў, А.* Прыціхне ў прыцемках Прыпяць [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://belarusy.net/anatol-grachanikau/prycixne-u-prycemkax-prypyac. — Дата доступу: 03.03.2023.
2. *Мятліцкі, М.* Мой боль вырастае да зор / М. Мятліцкі. — Мінск : Беларус. навука, 2016. — 429 с.
3. *Сіпакоў, Я.* Выбраныя творы : у 2-х т. Паэзія / Я. Сіпакоў ; прадм. Л. Ламекі. — Мінск : Маст. літ., 1995. — Т. 1. — 431 с.
4. *Арсеннева, Н.* Яшчэ адна вясна : выбраныя вершы / Н. Арсеннева. — Мінск : Маст. літ., 1996. — 271 с.
5. *Мальчэўская, Я.* 1986 [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://belarusy.net/yaugeniya-malcheuskaya/1986. — Дата доступу: 03.03.2023.
6. Зорка Палын : творы беларускіх паэтаў пра чарнобыльскую трагедыю ; уклад. А. І. Бельскага ; прадм. С. С. Шушкевіча. — Мінск : Маст. літ., 1993. — 255 с.
7. *Законнікаў, С.* Заклінанне : кн. паэзіі / С. Законнікаў. — Мінск : Маст. літ., 1991. — 151 с.

УДК 811.161.1’27:811.161.3’27

**К. А. Зуева**

*Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна», Брэст, Рэспубліка Беларусь*

# ДЭМАНАЛАГІЧНАЯ ЛЕКСІКА І ЯЕ ФУНКЦЫІ Ў ЗБОРНІКУ Я. БАРШЧЭЎСКАГА «ШЛЯХЦІЦ ЗАВАЛЬНЯ, АБО БЕЛАРУСЬ У ФАНТАСТЫЧНЫХ АПАВЯДАННЯХ»

**Уводзіны.** У гуманітарнай навуцы не страчваецца інтарэс да даследавання ўяўленняў пра звышнатуральную сілу, у тым ліку ў тэкстах мастацкіх твораў, «галоўнымі героямі якіх выступаюць дэманалагічныя персанажы, што эксплікуюць лінгвакультурныя і аўтарскія ўяўленні пра той свет» [1, с. 3].

Мэта артыкула — даследаванне дэманалагічнай лексікі і асаблівасцей яе функцыянавання ў зборніку Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях», так як у кнізе «сустракаюцца шматлікія вобразы беларускай міфалогіі» [2, с. 74], твор мае «арэол таямнічасці і нават алагічнасці асобных апісанняў» [2, с. 85].

Пад *дэманалагемамі* разумеюцца «моўныя адзінкі, што называюць нячыстую сілу» [3, с. 4], «якія набываюць статус ключавых знакаў, уключаюцца ў склад моцных пазіцый твора, выконваюць сэнсаўтваральную функцыю ў семантычнай прасторы містычнай фантастычнай прозы» [1, с. 7—8].

Фактычны матэрыял склалі адабраныя са зборніка Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» [4] дэманалагемы. Тлумачэнне лексічных адзінак ажыццяўлялася з апорай на слоўнікі [5; 6]. У працэсе даследавання праведзены аналіз дэманалагічнай і містычнай лексікі зборніка з апорай на класіфікацыі, прапанаваныя Л. Н. Вінаградавай [7], І. В. Кірылавай [3], Д. К. Новікавай [1], па змястоўна-тэматычнаму і дэфініцыйнаму параметрах.

**Асноўная частка.** Персанажная сфера дэманалагічнай сістэмы зборніка «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» можа быць прадстаўлена ў выглядзе «некаторай паслядоўнасці містычных персанажаў, якія размешчаны на ўмоўнай шкале паміж крайнімі пунктамі апазіцыі «чалавек» — «нечалавек» (дэман)» [7, с. 17]:

1. «Бліжэй да полюса “чалавек” размяшчаюцца людзі, якія свядома ўступілі ў сувязь з нячыстай сілай» [7, с. 17]: ***ЧАРАЎНІК*** ‘У казках і павер’ях — той, хто можа чараваць, валодае чарамі; вядзьмар’ [5]: «***Чараўнік*** *адчыніў дзверы, і ўся тая кусліваая жамяра знікла*» («Чараўнік ад прыроды і кот Варгін»); ***ЧАРНАКНІЖНІК*** ‘той, хто займаецца чарнакніжжам; вядзьмар, чараўнік’ [5]: «*Гляджу: ідуць па дарозе пан з* ***чарнакніжнікам*** *і раптам павярнулі да густога яловага лесу*» («Пра чарнакніжніка і пра цмока, што вылупіўся з яйка, знесенага пеўнем»).

2. «Далей на шкале ад полюса “чалавек” да полюса “нечалавек” размяшчаюцца істоты» [7, с. 17]: ***ВАЎКАЛАК*** ‘паводле паданняў — чалавек (часам мярцвяк), здольны абарочвацца ў воўка; пярэварацень’ [5]: «*О, пракляты* ***ваўкалак****!*» («Ваўкалак»); ***РУСАЛКА*** ‘міфалагічны вобраз усходнеславянскіх народаў у выглядзе жанчыны з доўгімі распушчанымі валасамі (нярэдка — з тулавам рыбы), якая жыве ў вадзе або жыце’ [5]: «*Але там на лугах і ў гаях гуляюць* ***русалкі****, на галовах у іх пекныя вянкі з валошак, вусны іх каралавыя, вочы ясныя, доўгія валасы падаюць на плечы, яны ветліва страчаюць вандроўнікаў*» («Жабер-Трава»).

3. «Да полюса “дэман” даводзіцца аднесці ўсю разнастайнасць міфічных вобразаў нячыстай сілы» [7, с. 18]: ***ДУХ*** ‘у міфалагічных і рэлігійных уяўленнях» бесцялесная, звышнатуральная істота, якая прымае ўдзел у жыцці прыроды і чалавека’ [5]; ***ХЛЕЎНІК*** «у беларускай міфалогіі — дух, які жыве ў хляве, займаючы задні вугал, назірае за жывёлай» [6, с. 157]. ***ДАМАВІК*** ‘у народных павер’ях — злы або добры дух, які жыве ў кожным доме’ [5]; ***ЛЯСУН*** ‘у славянскай міфалогіі — жыхар лесу, лясны дух’ [5]: «*Можа, гэта <…> проста фантазія люду беларускага, якому заўсёды мрояцца чары і духі ў разматых постацях, і ў кожнай з гэтых істотаў свой абавязак: духі водныя (****вадзянікі****), духі зямныя (****хлеўнікі****), хатнія (****дамавікі****), вартаўнікі* ***лясоў (лесуны)****…*» («Успаміны пра наведанне роднага краю»); ***ВАДЗЯНІК*** ‘у народных павер’ях — уладар вадаёмаў, які жыве ў вадзе [5]: «*Кажуць, нібы* ***вадзяніка****, слухаюць цябе вецер і хвалі*» («Рыбак Родзька»).

© Зуева К. А., 2023

Репозиторий БарГУ

Асобна знаходзіцца «вобраз **чорта**, які можа замяшчаць амаль любы дэманалагічны вобраз, выступаючы ў ролі абагульненай (радавой) фігуры для абазначэння любых персанажаў нячыстай сілы» [7, с. 19]: ***ЧОРТ*** ‘паводле забабонных уяўленняў — злы дух, які мае выгляд істоты, пакрытай чорнай поўсцю, з рагамі, капытамі і хвастом; д’ябал’ [5]: «*У ціхым балоце* ***чэрці*** *родзюцца*» («Рыбак Родька»); ***Д’ЯБАЛ*** ‘у рэлігійных уяўленнях — злы дух, чорт, сатана’ [5]: «*...на спакойнай вадзе* ***д’ябал****, чорны, як вугаль, рукі надта доўгія, галава велізарная, сядзіць на самай сярэдзіне возера, падкурчыўшы ногі, грае на дудзе і спявае страшэнным голасам*» («Рыбак Родзька»); ***ШАТАН*** ‘сатана, д’ябал’ [5]: «*...сонца ўжо схавалася, а яны яшчэ доўгі час чулі за сабою голас дуды і страшны спеў* ***шатанаў***» («Рыбак Родзька»); ***НЯЧЫСЦІК*** ‘у забабонах — нячыстая сіла, чорт’ [5]: «*І тут адзін рыбак з гэтага гурту расказаў, як* ***нячысцік*** *падмануў яго…*» («Рыбак Родзька»).

Асобную групу складаюць лексемы, якія абазначаюць «клас памёрлых людзей» [7, с. 18]: ***НЯБОЖЧЫК*** ‘мёртвы чалавек; мярцвяк’ [5]: «*...здавалася, што яго вусны, бледныя, як у* ***нябожчыка****, варушыліся…*» («Валасы, якія крычаць на галаве»); ***ТРУП*** ‘мёртвае цела чалавека або жывёлы’ [5]: «*...бачыць выкінуты вадою* ***труп****, які хваля яшчэ пакрывала пенаю…*» («Пра чарнакніжніка і пра цмока, што вылупіўся з яйка, знесенага пеўнем»).

Заслугоўваюць увагі **лексемы, звязаныя з містыкай**, **тым светам**, якія называюць: 1) абстрактнае паняцце: ***ЧАРЫ*** ‘паводле забабонных уяўленняў — магічныя прыёмы, пры дапамозе якіх можна ўздзейнічаць на людзей і прыроду’ [5]: «*...заўсёды мрояцца* ***чары****...*» («Успаміны пра наведанне роднага краю»); 2) час: ***РАБІНАВАЯ НОЧ*** «цёмная летняя ноч з громам, маланкай, праліўным дажджом або з бесперапыннымі зарніцамі. Такая ноч бывае ў канцы лета (на Іллю — 2 жніўня). Назва звязана з уяўленнямі аб рабіне як «чартагоннай» расліне. Міфалагічны змест рабінавай ночы — барацьба вогненных нябесных сіл з зямной нечысцю. Згодна з народнымі павер’ямі, у гэтую ноч з пекла на свет выходзяць усе злыя сілы, а ўсе стыхіі (маланка, вецер, дождж) аб’ядноўваюцца для барацьбы з ёю» [6, с. 132]: «*Будзе* ***рабінавая ноч****!*» («Успаміны пра наведванне роднага краю»); 3) колер: ***ЧОРНЫ*** ‘паводле забабонных уяўленняў — чарадзейны, звязаны з нячыстай сілай’ [5], гэты «колер — абавязковы атрыбут нячыстай сілы, які надзяляўся негатыўнай сімволікай, авязанай з уяўленнямі аб ночы, цемры, безжыццёвааці, замагільным свеце, смерці і жалобе» [6, с. 161]: «*…які цудоўны кот, вялікі, поўсць блішчастая, увесь* ***чорны****, як вугаль, вочы гараць*» («Чараўнік ад прыроды і кот Варгін»); 4) дзеянне: ***ВАРАЖЫЦЬ*** ‘адгадваць будучае або мінулае; вабіць, зачароўваць’ [5]: «*— А цяпер самы час* ***варажыць****, — сказаў Сівоха*» («Цыган Базыль»).

**Заключэнне.** Такім чынам, «выкарыстанне Я. Баршчэўскім народнае фантастыкі — гэта мастацкі прыём пісьменніка, неабходны яму дзеля ўвасаблення пэўнай ідэйна-эстэтычнай канцэпцыі» [2, с. 87]. Дэманалагічная і містычная лексіка зборніка «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» служыць для мадэлявання містыка-фантастычнага свету, асноўныя функцыі якой: намінатыўная, характаралагічная, экспрэсіўная, эмацыйна-ацэначная, пазнавальная.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. *Новикова, Д. К.* Функционально-прагматические особенности демонологической лексики (на материале текстов фантастической прозы) [Электронный ресурс] : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.19 / Д. К. Новикова ; Северо-Кавказ. федер. ун.-т. — Ставрополь, 2017. — 32 с. — Рэжым доступу: https://www.dissercat.com/content/funktsionalno-pragmaticheskie-osobennosti-demonologicheskoi-leksiki-na-materiale-tekstov-fan/read. — Дата доступу: 21.04.2023.

2. *Khaustovich, M.* Ян Баршчэўскі: «А ці разумееш, хто была тая плачка?» / M. Khaustovich // Szlakami ku białoruskości: szkice, artykuły, eseje. — Warszawa : Wyd. Uniw. Warszawskiego, 2010. — S. 9—197.

3. *Кирилова, И. В.* Семантическое поле «нечистая сила»: лингвокультурологический аспект [Электронный ресурс] : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.01 / И. В. Кирилова ; Уральск. гос. пед. ун-т. — Екатеринбург, 2011. — 23 с. — Рэжым доступу: https://www.dissercat.com/content/semanticheskoe-pole-nechistaya-sila/read. — Дата доступу: 04.01.2023.

4. *Баршчэўскі, Я.* Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях [Электроны рэсурс] / Я. Баршчэўскі // Флибуста. Книжное братство. — Рэжым доступу: http://flibusta.site/b/391779. — Дата доступу: 21.04.2023.

5. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы [Электронны рэсурс] : у 5 т., 6 кн. / Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства ; пад агул. рэд. К. К. Атраховіча (К. Крапівы). — Мінск : Беларус. Савец. Энцыкл., 1977—1984. — 5 т., 6 кн. — Рэжым доступу: https://verbum.by/tsbm. — Дата доступу: 21.04.2023.

6. *Коваль, У. І.* Народныя ўяўленні, павер’і і прыкметы: даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі / У. І. Коваль. — Гомель : Беларус. агенцтва навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 1995. — 180 с.

7. *Виноградова, Л. Н.* Славянская народная демонология: проблемы сравнительного изучения [Электронны рэсурс] : дис. в виде науч. докл. … д-ра филол. наук : 10.01.09 / Л. Н. Виноградова ; Ин-т славяноведения РАН. — М., 2001. — 96 с. — Рэжым доступу: https://inslav.ru/images/stories/pdf/Referaty/Vinogradova_2001.pdf. — Дата доступу: 04.01.2023.


Рэпазіторый БарДУ